# ПАДРЫХТОЎКА СПЕЦЫЯЛІСТАЎ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЙ СФЕРЫ: КІРУНКІ, ТЭХНАЛОГІІ, ЗМЕСТ

**В. М. Бігеза,** *дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

## АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭЧНАГА СПЕЦЫЯЛІСТА ПА РАБОЦЕ З ДЗЕЦЬМІ Ў СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Павышэнне ролі адукацыі і культуры ў XXI ст. абумоўліваюць высокія патрабаванні да прафесіяналізму спецыялістаў сферы культуры, у тым ліку і бібліятэкараў, якія працуюць з дзецьмі.

Неабходна адзначыць, што праблемы ўдасканальвання бібліятэчнай адукацыі з'яўляюцца прадметам вывучэння многіх спецыялістаў. Што тычыцца асаблівасцяў падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі, то яны знайшлі адлюстраванне ў доктарскіх дысертацыях В. І. Чэрнічэнкі, Г. А. Івановай, кандыдацкіх дысертацыях В. П. Чудзінавай, І. М. Немчынай, І. І. Ціхаміравай і нш. Адзначым, што ў дысертацыйным даследаванні В. І. Чэрнічэнкі вызначаны канцэптуальны падыход да вышэйшай адукацыі. Па яе сцвярджэнні, асноўная мэта вышэйшай школы заключаецца ў фарміраванні светапогляду цэласнай асобы, якая здольна адэкватна рэагаваць на эканамічную, палітычную і іншыя сітуацыі ў краіне, зыходзячы з маральна-этычных каштоўнасцяў [1].

На нашу думку, такое вызначэнне мэты вышэйшай адукацыі сугучна сучаснаму кампетэнтнаснаму падыходу, які пакладзены ў аснову падрыхтоўкі будучага спецыяліста ВНУ на пад-

ставе фарміравання акадэмічных кампетэнцый, сацыяльна-асобасных кампетэнцый, прафесійных кампетэнцый.

Агульныя мэты падрыхтоўкі спецыяліста сёння прадугледжваюць фарміраванне і развіццё спецыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці, якая дазваляе спалучаць акадэмічныя, прафесійныя, сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі для вырашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці.

Названыя кампетэнцыі, якія выкарыстоўваюцца пры адпаведным падыходе да падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў, безумоўна, прадвызначаюць сфарміраванасць у асобы ўнутранай матывацыі, псіхалагічнай і практычнай гатоўнасці для дасягнення як мага больш якасных вынікаў у сваёй прафесійнай дзейнасці, сацыяльным жыцці.

Неабходна падкрэсліць, што вырашэнне прафесійных задач выпускніка ВНУ дасягаецца на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў праз вывучэнне цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, цыкла агульна-прафесійных і спецыяльных дысцыплін і дысцыплін спецыялізацыі, якія вызначаны ў вучэбным плане па падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў, у тым ліку і бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі.

Вывучэнне названых цыклаў дысцыплін садзейнічае фарміраванню вышэйадзначаных кампетэнцый. У наш час рэалізацыя асноўнай адукацыйнай праграмы ВНУ па падрыхтоўцы бібліятэчнага спецыяліста павінна здзяйсняцца на высокім узроўні, які прадугледжвае наяўнасць неабходнага лабараторна-практычнага і інфармацыйнага забеспячэння навучальнага працэсу, магчымасць доступу кожнага студэнта да бібліятэчных фондаў, сеткавых крыніц інфармацыі і БД, дастатковай наяўнасцю вучэбна-метадычных матэрыялаў, а таксама мультымедыйных, аўдыя- і відэаматэрыялаў па ўсіх відах вучэбнай дзейнасці, уключаючы пазааўдыторную (кіруемую) самастойную работу.

Шматаспектнасць падрыхтоўкі бібліятэчнага спецыяліста па рабоце з дзецьмі абумоўлена, на нашу думку, двума фактарамі: па-першае, дзеці ва ўсім свеце, у тым ліку і ў нашай краіне, пачынаюць усведамляцца як самая вялікая каштоўнасць, а па-другое, менавіта бібліятэка з'яўляецца найгалоўнейшым сацыяльным інстытутам, які выкарыстоўвае ўсе існуючыя рэсурсы дзеля стварэння асяроддзя развіцця дзіцяці праз чытанне, кнігу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і нетрадыцыйныя віды носьбітаў інфармацыі. Тут адбываецца выхаванне духоўнасці дзяцей, падлеткаў праз далучэнне да агульначалавечых каштоўнасцяў, гуманістычных ідэалаў.

На падставе вышэйадзначанага мы лічым, што адной з адметнасцяў падрыхтоўкі бібліятэкара, які працуе з дзецьмі, з'яўляецца яго гатоўнасць да працы па сацыяльным выхаванні дзяцей, падлеткаў, значнасць якога сфармулявана ў рэзалюцыі «Міжнароднае дзесяцігоддзе культуры ненасілля і міра ў інтарэсах дзяцей планеты (2001–2010)», прынятай генеральнай Асамблеяй ААН (2000). Сацыяльнае выхаванне разглядаецца навукоўцамі як сістэма, якая педагагічна арыентавана і мэтазгодна накіравана на грамадскую дапамогу названым катэгорыям у перыяд іх уваходжання ў сацыяльнае жыццё. І тут, мы мяркуем, важна сфарміраваць у студэнтаў сацыяльнае мысленне, якое па вызначэнні К. А. Абульханавай-Слаўскай «з'яўляецца састаўной часткай суб'ектнасці чалавека, яго "жыццёвых сіл", яго здольнасці да эмацыянальна-валявой самарэгуляцыі, самасцвярджэння, праектавання свайго асобаснага росту» [2].

Фарміраванне сацыяльнага мыслення студэнтаў можа адбывацца праз вывучэнне шэрагу сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, праз удасканальванне методыкі навучання, укараненне прынцыпаў практычнай накіраванасці навучання і праблематызацыі. На думку спецыялістаў, менавіта адукацыйныя тэхналогіі, заснаваныя на прынцыпе праблематызацыі, забяспечваюць паспяховасць асобы ў прафесійнай сферы, гатоўнасць да дзеянняў у нетыповай сітуацыі, накіраванасць на самаразвіццё [3].

Адзначым таксама, што педагагічная сутнасць будучых бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі патрабуе глыбокага ведання псіхалогіі чалавека, заканамернасцяў цячэння псіхалагічных працэсаў, асноўных тэндэнцый індывідуальна-псіхалагічных адрозненняў, асаблівасцяў псіхолага-педагагічнага ўздзеяння кнігі і чытання на чытача.

Па сцвярджэнні В. Л. Жук, менавіта ў працэсе асваення педагогікі і псіхалогіі ў студэнтаў фарміруюцца ўніверсальныя псіхолага-педагагічныя кампетэнцыі, якія, у сваю чаргу, садзейнічаюць развіццю больш агульных сацыяльна-асобасных кампетэнцый, накіраваных на вырашэнне шырокага кола прафесійных, сацыяльных і асобасных праблем і задач, якія аб'ектыўна ўзнікаюць у прафесійнай сферы [4]. Таму, побач са спецыяльнымі, вядучую ролю павінны адыгрываць псіхолага-педагагіч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя веды і ўменні. Для іх набыцця студэнтам спецыялізацыі «Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва» мэтазгодна вывучаць не толькі агульныя курсы педагогікі і псіхалогіі, але, па-нашым меркаванні, арганізацыя ўсяго вучэбнага працэсу павінна быць пабудавана на імкненні да інтэграцыі выкладання псіхолага-педагагічных, агульнагуманітарных і спецыяльных дысцыплін. З гэтымі мэтамі выкладчыкі могуць распрацоўваць інтэграваныя курсы, спецкурсы, індывідуальныя вучэбна-даследчыя заданні, якія раскрываюць для студэнтаў сутнасць абранай прафесіі, дапамогуць камунікатыўнай кампетэнтнасці будучага спецыяліста.

Улічваючы той факт, што бібліятэкар па рабоце з дзецьмі ў значнай ступені – педагог, навучальны працэс павінен быць арыентаваны на развіццё і самаразвіццё асобы студэнта, на стварэнне ўмоў для яго творчай педагагічнай самаактуалізацыі і фарміравання яго пазітыўнай «Я-канцэпцыі», якая, па сцвярджэнні псіхолагаў, вызначае адносіны чалавека да іншых людзей і навакольнага свету (Р. Бёрнс). Менавіта пры такіх падыходах, выкарыстоўваючы камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, спрэчка-дыялог, вучэбныя дэбаты), праектныя гульнявыя тэхналогіі (дзелавыя, ролевыя, імітацыйныя гульні) выкладчык будзе мець магчымасць вызначыць суб’ектную пазіцыю студэнтаў у вучэбнай дзейнасці, набыццё імі вопыту прымянення фарміруемых кампетэнцый дзеля вырашэння будучых сацыяльных і прафесійных задач.

Важна падкрэсліць, што прафесійная педагагічная падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў паглыбляецца ў час вывучэння дысцыплін спецыялізацый. Прыкладам таму з’яўляюцца такія дысцыпліны спецыялізацыі, як «Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва», «Бібліяграфія літаратуры для дзяцей і юнацтва», «Фарміраванне інфармацыйнай культуры школьнікаў», «Сусветная і беларуская дзіцячая літаратура» і інш. Вывучэнне названых дысцыплін паглыбляе псіхолага-педагагічныя веды студэнтаў адносна валодання прыёмамі вывучэння і вырашэння псіхалагічных праблем чытання і звязаных з ім бібліятэчных зносін, а таксама псіхолага-педагагічнымі асновамі ўзаемадзеяння бібліятэкара з чытачом у працэсе бібліятэчнага абслугоўвання.

Сучасныя бібліятэчныя спецыялісты, якія працуюць з дзецьмі, павінны мець глыбокую падрыхтоўку ў галіне бібліятэчна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічнага абслугоўвання юных чытачоў з прычыны складанасці і супярэчлівасці гэтага працэсу. З аднаго боку, наступленне інфармацыйнай эры з усімі яе плюсамі і мінусамі, а з другога боку, патрэбнасць захавання чытання.

Спецыялісты лічаць, што неабходна выхоўваць і развіваць у дзяцей здольнасць чытаць як умову выжывання ў інфармацыйным грамадстве. Менавіта чытанне дае магчымасць доступу будучаму спецыялісту да вядучых крыніц інфармацыі: кнігі, перыядычным выданням, БД, інтэрнэту і інш. І важная задача бібліятэкараў дзіцячых, школьных бібліятэк, педагогаў, бацькоў улюбіць дзяцей у літаратуру, дапамагчы ім сфарміраваць мастацкі густ, наблізіўшы да творчасці класікаў, прывіць на ўсё жыццё навыкі пазнання цудоўнага.

Разам з тым, узрастае праблема адбору, перакладу і паказу юным лепшых матэрыялаў з сусветнай культуры для дзяцей (твораў і развівальных праграм, разнастайных электронных рэсурсаў). Усё гэта вымагае адпаведнай падрыхтоўкі бібліятэкараў, што працуюць з дзецьмі, як у галіне літаратуры, так і новых інфармацыйных тэхналогій. Таму, на наш погляд, ёсць сэнс паглыбляць «літаратурную» падрыхтоўку студэнтаў, якая дапаможа ім у будучай прафесійнай дзейнасці.

Адным з ключавых патрабаванняў да сучаснага бібліятэчнага спецыяліста, у тым ліку і таго, які працуе з дзецьмі, становіцца валоданне інфармацыйнымі кампетэнцыямі. Менавіта інфармацыйная кампетэнтнасць прызнана сусветнай супольнасцю базавай (ключавой) кампетэнтнасцю асобы для жыцця ў XXI стагоддзі.

Інфармацыйная кампетэнтнасць разглядаецца сёння спецыялістамі як інтэграванае спалучэнне інфармацыйнай граматнасці і культуры, а таксама ўменне здзяйсняць інфармацыйную дзейнасць, у тым ліку і з выкарыстаннем аўтаматызаваных тэхналогій (Н. І. Гендзіна, Г. Б. Паршукова).

У якасці сумежнай трактоўкі дэфініцыі паняцця інфармацыйная кампетэнтнасць асобы неабходна мець на ўвазе інфармацыйную культуру, якая значна шырэйшая за інфармацыйную кампетэнтнасць.

Выкладанне курса «Фарміраванне інфармацыйнай культуры школьнікаў» для студэнтаў спецыялізацыі ў пэўнай ступені мае практычны накірунак і дазваляе студэнтам прафесійна авало-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даць ведамі, уменнямі па выхаванні інфармацыйнай культуры на розных этапах развіцця чытача.

Не меншую актуальнасць мае сёння і падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі ў галіне краязнаўства. Краязнаўчая бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць разумеецца сёння як спосаб узнаўлення духоўнай культуры, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, вышэйшая форма патрыятычнага і маральнага выхавання.

Падрыхтоўка будучага бібліятэчнага спецыяліста ў галіне краязнаўчай дзейнасці патрабуе, безумоўна, комплекснага падыходу. Гэта шматаспектны працэс, які ўключае стварэнне ўмоў для развіцця матывацыйнай, пазнавальнай і валявой сфер. Усе гэтыя галіны чалавечай індывідуальнасці павінны раскрыцца праз механізмы самаразвіцця, накіраванасці на асобны краязнаўча-прафесійны рост, самаактуалізацыю.

Лекцыйныя, практычныя, лабараторныя заняткі ў курсе «Краязнаўчая бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць дзіцячых бібліятэк» дазваляюць студэнтам атрымаць спецыяльную краязнаўчую падрыхтоўку па фарміраванні, размяшчэнні, захаванні краязнаўчых фондаў дзіцячай бібліятэкі, адметнасцях складу і структуры краязнаўчага ДБА, асновах методыкі бібліяграфавання краязнаўчых дакументаў, стварэнні разнастайных першасных і другасных дакументаў для дзяцей рознага ўзросту і кіраўнікоў дзіцячага чытання. Гэта, напрыклад, пошукавая летапісная работа, стварэнне бібліяграфічных дапаможнікаў у галіне краязнаўчай бібліяграфіі дзіцячай літаратуры і інш.

Адзначым, што толькі добра падрыхтаваныя ў рэгіянальным аспекце выпускнікі спецыялізацыі зразумеюць, што краязнаўчая бібліятэчна-бібліяграфічная работа дзіцячай бібліятэкі – гэта штодзённая праца па вырашэнні педагагічных праблем, звязаных з краязнаўчай работай з дзецьмі.

Акрэсліваючы асноўныя накірункі прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэчнага спецыяліста па рабоце з дзецьмі, неабходна падкрэсліць важнае значэнне практычнай накіраванасці навучання. Таму цеснае супрацоўніцтва выкладчыкаў ФІДК з бібліятэкарамі ў рамках вучэбна-навукова-вытворчага комплексу паміж кафедрай менеджменту ІДС і Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкай імя М. Астроўскага дазваляе студэнтам пазнаёміцца з інавацыйнай дзейнасцю бібліятэкі, замацаваць атрыманыя веды, уменні непасрэдна на практыцы, адаптавацца да зносін з

карыстальнікамі ў рэальнай працы, а выкладчыкам актуалізаваць тэматыку курсавых і дыпломных прац у адпаведнасці з вытворчай неабходнасцю бібліятэкі.

Падкрэслім таксама, што базавым кампанентам прафесійнай падрыхтоўкі будучых бібліятэчных спецыялістаў з'яўляецца СРС. Навукоўцы ў галіне педагогікі выдзяляюць сёння тры яе формы – кантралюемую, кіруючую работу і самаадукацыю, у ходзе выканання якой студэнты набываюць неабходны для развіцця кампетэнтнасці вопыт самаадукацыі, даследчай, праектнай, рэфлексіўнай дзейнасці.

Такім чынам, на падставе вышэйадзначанага можна канстатаваць, што ў наш час мае канцэптуальнае значэнне пераарыентацыя працэсу навучання шляхам прымянення кампетэнтнаснага падыходу, які накіраваны на развіццё прафесіянала і асобы. Мы ўпэўніліся таксама, што падрыхтоўка бібліятэчнага спецыяліста па рабоце з дзецьмі шматаспектная і базіруецца на авалодванні будучымі прафесіяналамі ключавымі кампетэнцыямі, якія прадвызначаюць сфарміраванасць у асобы ўнутранай матывацыі, псіхалагічнай і практычнай гатоўнасці для дасягнення як мага больш якасных вынікаў у сваёй прафесійнай дзейнасці і сацыяльным жыцці.

Вучэбны працэс і практыка-арыентаваная падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі бесперапынныя ў фарміраванні іх прафесійных кампетэнцый, а гэта, у сваю чаргу, вымагае навуковы і метадычны пошук супрацоўніцтва, а з боку ВНУ – пошук новых, сучасных прыёмаў інавацыйнага навучання, сродкаў і спосабаў развіцця творчага мыслення студэнтаў, іх усвядомленых адносін да абранай прафесіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Черниченко, В. И.* Теоретические и методические основы профессионально-педагогической подготовки специалистов в вузе культуры и библиотечной работы с подрастающим поколением : автореф. дис… д-ра пед.наук / В. И. Черниченко; Моск. гос. ун-т культуры. – М., 1994. – 32 с.

2. *Абульханова-Славская, К. А.* Проблемы исследования индивидуального сознания / К. А. Абульхамова-Славская, М. И. Воловикова, В. А. Елисеев // Психологический журнал. – 1991. – № 4. – Т.12. – С. 27–40.

3. Библиотечно-информационное образование: новые концепции и технологии развития: монография / И. С. Пилко [и др.]. – М. : Литера, 2014. – 300 с. – (Современная библиотека).

4. *Жук, О. Л.* Педагогическая подготовка студентов : компетентностный подход / О. Л. Жук. – Минск : РИВШ, 2009. – 335 с.